# Уводзіны ў мовазнаўства

# ***Поліфункцыянальнасць і дыферэнцыяцыя мовы***

Тэма 1.3,

разлічана на 1 г. лекцыйнага часу

# *Асноўныя пытанні*

- **Дыферэнцыяцыя (= падзел) мовы**
- **Прынцыпы дыферэнцыяцыі мовы**
- **Тэрытарыяльная дыферэнцыяцыя мовы**
- **Сацыяльная дыферэнцыяцыя мовы**
- **Функцыянальная дыферэнцыяцыя мовы**
- **Норма мовы**
- **Узус**
- **Агульнанародная мова**
- **Літаратурная мова**
- **Функцыі мовы**

# Дыферэнцыяцыя мовы

- Мова – **з’ява шматаспектная і поліфункцыянальная.**
- Мова здольна да вар’явання ў залежнасці ад асаблівасцей яе ўжывання.
- Таму яна дыферэнцуецца (= падзяляецца) па розным прыкметам і існуе як сістэма розных варыянтаў.

# *Прынцыпы дыферэнцыяцыі мовы*

- **Існуе 3 асноўныя прынцыпы дыферэнцыяцыі мовы:**
- **- *тэрытарыяльны***
- **- *сацыяльны***
- **- *функцыянальны.***

- **Існуе таксама прадметны падзел мовы на галіновыя/ прадметныя падмовы.**

# *Тэрытарыяльная дыферэнцыяцыя мовы*

- **Традыцыйна** вынікам тэрытарыяльнай дыферэнцыяцыі мовы (падзелу мовы на тэрытарыяльныя варыянты) лічыліся *дыялекты*, або *гаворкі*.
- **У сучаснай лінгвістыцы** існуюць таксама паняцці *нацыялектаў*, *рэгіяналектаў*, *урбаналектаў* і г.д.
- *Не ўсе нацыялекты маюць дыялекты*, гэта асаблівасць *спрадвечных* тэрыторый пашырэння пэўнай мовы (= *моўных арэалаў*).

# *Вынікам сацыяльнай дыферэнцыяцыі мовы -*

- ***падзелу мовы на варыянты ў залежнасці ад сацыяльных прыкмет*** **- лічыліся *жаргоны (у шырокім сэнсе слова).***
- **У сучаснай лінгвістыцы прыняты іншы тэрмін – *сацыялект*, а тэрмін *жаргон* ужываецца ў вузкім сэнсе *нестандартнага варыянта мовы, абумоўленага асаблівасцямі супольнасці, якая яго ўжывае.***
- **Прыклады: *прафесійны жаргон; жаргон моладзі = слэнг; жаргон крымінальных сфер = арго і інш.***

# *Гаворкі і рэгістры*

- **Дыялекты могуць у сваю чаргу падзяляцца на спецыфічныя для пэўных арэалаў** (= тэрыторый) ***гаворкі***.
- **Сацыялекты ў сваіх межах, у залежнасці ад пэўнага набору сацыяльных прымет, могуць падзяляцца на *рэгістры***,
- напрыклад:
- *прафесійная мова ўрачэй – сацыялект; прафесійная мова ўрачэй-жанчын – рэгістр*.

# *Функцыянальная дыферэнцыяцыя мовы*

- **азначае *падзел на функцыянальныя стылі* = падзел стандартнага варыянту мовы (=літаратурнай мовы) на варыянты *ў залежнасці ад сферы зносін (функцыянавання мовы).***
- Упершыню ўведзены ў мовазнаўства прадстаўнікамі **Пражскай функцыянальнай лінгвістыкі.**

# *Функцыянальныя стылі*

- **Прыклады функцыянальных варыянтаў:**
- ***Навуковы стыль***
- ***Публіцыстычны стыль***
- ***Дзелавы стыль* і г.д.**

# *Узус*

- **Узус = *абагульненне найбольш пашыраных моўных практык* (тое, як прынята гаварыць у пэўны час у пэўным месцы) – *праблема моўных стэрэатыпаў.***
- ***Абумоўліваецца пазамоўнымі фактарамі.***

# *Норма мовы*

- **Прыняты ў пэўным грамадстве/ соцыўме моўны стандарт.**
- ***Выбар з усіх магчымых варыянтаў аднаго (рэдка некалькіх) у якасці стандартнага(ых), абавязковага (ых).***

# *Узаемадзеянне ўзуса і нормы мовы*

- **Узус дае адказы на пытанні:**

***Як прынята гаварыць?***

***Як звычайна гавораць?***

- **Норма дае адказы на пытанні:**

***Як трэба гаварыць?***

***Як нельга гаварыць?***

- **Узус не абавязкова супадае з нормай, а норма можа змяняцца ў залежнасці ад узуса.**

# *Унармаванне мовы -*

- **важная частка моўнай палітыкі дзяржавы.**
- **Норма замацоўвае правільныя:**
- **Вымаўленне –** ***арфаэпічная норма,***
- **Напісанне –** ***нормы графікі, арфаграфіі і пунктуацыі.***

**Ёсць таксама** ***граматычныя, лексічныя, стылістычныя нормы*****.**

# *Методыкі навучання мовам*

- **Норма** **Узус**
- **Стандартная** **Камунікатыўная**

# *Агульнанародная мова і літаратурная мова*

- *Агульнанародная мова* = мова як сукупнасць усіх яе формаў існавання (варыянтаў).
- *Літаратурная мова* = унармаваная (стандартная) частка агульнанароднай мовы.

# *Функцыі мовы*

- **Першаснай функцыяй мовы з’яўляецца АДЛЮСТРАВАЛЬНАЯ функцыя**

- **мова = МАДЭЛЬ СВЕТУ 1-га парадку.**

**Дазваляе мове выконваць дзве асноўныя функцыі мовы:**

**- кагнітыйўную,**

**- камунікатыйўную.**

# *Мова таксама выконвае функцыі:*

- **інфарматыўную,**
- **эмацыйную,**
- **эстэтычную,**
- **паэтычную,**
- **металінгвістычную** (дае магчымасць перадачы знакаў адной лінгвістычнай сістэмы знакамі іншай),
- **(а)кумулятыўную** (фіксуе чалавечы вопыт),
- **валюнтатыўную** (перадае волю чалавека),
- іншыя функцыі.